ПАДЗЕЯ

# ЛІТДЭСАНТ НА ЖУРФАКУ

**17 красавіка 2023 года прадстаўнічая дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі выступіла на журфаку Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Арганізавала і правяла сустрэчу педагог, член СПБ, літаратуразнаўца Аліна Сабуць.**



У рамках ініцыяванага Алінай Эдмундаўнай доўгатэрміновага праекта пад назвай «Літаратурныя ўніверсітэты» сустрэчы пісьменнікаў са студэнтамі галоўнай вышэйшай навучальнай установы Прынёмання праходзяць рэгулярна. Але традыцыя толькі тады чагосьці вартая, калі яна мае працяг.

Гэтым разам у пісьменніцкую дэлегацыю на чале са старшынёй ГрАА СПБ, паэтэсай Людмілай Кебіч увайшлі: празаікі Галіна Богдан (псеўданім Ліна Багданава) і Кацярына Насута (псеўданімы Карына Дзёміна і Кацярына Лесіна); паэтэса Людміла Шаўчэнка; паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык і, зразумела, літаратуразнаўца, літаратурны крытык, паэтэса, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы Аліна Сабуць. Гаспадарамі сустрэчы сталі студэнты II курса спецыяльнасці «Журналістыка» і «Інфармацыя і камунікацыя» ГрДУ імя Янкі Купалы. Падчас брыфінг-дыялогу на тэмы «Сучасны літаратурны працэс», «Літаратурная Гродзеншчына: постаці, праблемы, перспектывы» госці расказалі пра сваю творчасць, правялі

прэзентацыі кніг, прачыталі свае творы, запрасілі моладзь да супрацоўніцтва з пісьменніцкай арганізацыяй вобласці, адказалі на пытанні. Студэнты, у сваю чаргу, праявілі сябе зацікаўленымі, гатовымі да дыялогу. У рамках спецкурса прадугледжана паглыбленае вывучэнне творчасці сучасных пісьменнікаў Гродзеншчыны (на выбар). У матэрыяле для даследаванняў няма недахопу.

Напрыклад, аўтар чатырох дзясяткаў кніг для дарослых, дзяцей і падлеткаў, празаік Ліна Багданава распавяла пра свае аўтарскія кніжныя серыі «В контакте», «Тусовка.by» і «Взрослые дети», якія выходзяць у выдавецтве «Народная асвета». Кацярына Насута пазнаёміла юных чытальнікаў з некаторымі з сямі дзясяткаў сваіх раманаў у жанры фэнтэзі, патлумачыла, што такое «камерцыйная літаратура». Людміла Шаўчэнка закранула некаторыя старонкі сваёй біяграфіі, адлюстраваныя ў паэтычных радках. Людміла Кебіч прапанавала разгорнуты агляд дзейнасці Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, а Дзмітрый Радзівончык выступіў з экскурсам па афіцыйным інтэрнэт-сайце ГрАА СПБ www.pisateli.by. Прачытаныя аўтарамі паэзію і прозу аўдыторыя сустракала шчырымі апладысментамі. Нязмушаную атмасферу добразычлівага дыялогу ўмела падтрымлівала мадэратар сустрэчы, навуковец і педагог Аліна Сабуць.

Удзельнікі дэлегацыі шчыра падзякавалі гаспадарам за гасціннасць і выказалі ўпэўненасць у тым, што такія змястоўныя, узаемна карысныя сустрэчы паміж пісьменнікамі і зацікаўленай моладдзю (тым больш, будучымі журналістамі) абавязкова павінны працягвацца.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** 17 красавіка 2023 года ў рамках доўгатэрміновага праекта пад назвай «Літаратурныя ўніверсітэты» прадстаўнічая дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі выступіла на журфаку ГрДУ імя Янкі Купалы.







**Галіна Богдан, Людміла Кебіч, Людміла Шаўчэнка, Аліна Сабуць, Кацярына Насута**








302
КАБІНЕТ СІНХРОННАГА ПЕРАКЛАДУ
СТУДЭНЦКАЕ БЮРО ПЕРАКЛАДАЎ
MCMXL
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
ВУЧЭБНАЯ РАБОТА


MCMXL
ГРОДЗЕНСКІ
ДЗЯРЖАЎНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ